БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.09(092)(043.3)

КРУГЛОВА
ВОЛЬГА ВАЛЯНЦІНАЎНА

# ТВОРЧАСЦЬ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2019

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

| | |
|---|---|
| **Навуковы кіраўнік** | **Бельскі Аляксандр Іванавіч,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| **Афіцыйныя апаненты:** | **Тычко Галіна Казіміраўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| | **Бурдзялёва Ірына Аляксееўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» |
| **Апаніруючая арганізацыя** | УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» |

Абарона адбудзецца 25кастрычніка 2019 года ў 14:30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 327-63-78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы 20 верасня 2019 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый М. М. Хмяльніцкі

# УВОДЗІНЫ

Янка Лучына (1851–1897) – адметная творчая асоба ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя – этапу станаўлення беларускай нацыянальнай літаратуры, калі ўзнікла патрэба ў адлюстраванні розных бакоў грамадскага жыцця, мадэляванні ў мастацкіх творах тыповых жыццёвых сітуацый, паказе духоўнага, маральнага і культурнага аблічча народа. Янка Лучына праявіў свой талент як паэт, публіцыст, перакладчык, культурны дзеяч, драматург, этнограф і літаратурны крытык. У эпоху пазітывізму і рэалізму ён працягваў рамантычныя традыцыі, пашыраючы ідэйную накіраванасць, праблематыку і тэматыку твораў, дапаўняючы іх новымі вобразамі і матывамі, і заклаў асновы для развіцця беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя.

Існуе шэраг прац, прысвечаных асобным аспектам творчасці Янкі Лучыны. Аднак цэласнае даследаванне спадчыны пісьменніка адсутнічае. Не асэнсавана значэнне асобы і творчасці Янкі Лучыны ў станаўленні і развіцці новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Аўтарам дысертацыйнага даследавання ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве праведзены сістэмна-комплексны аналіз творчасці Янкі Лучыны, што дае магчымасць разглядаць асобу і паэтычную спадчыну пісьменніка ў міждысцыплінарным (у рамках філалогіі, гісторыі, культуралогіі) і міжнародным (з пазіцыі беларуска-польскіх культурных узаемасувязей) навуковым кантэксце. Цікавасць да спадчыны Янкі Лучыны як беларускіх, так і польскіх даследчыкаў сведчыць пра запатрабаванасць яго творчасці.

**Актуальнасць** даследуемай навуковай тэмы вызначаецца тэарэтычнымі і практычнымі задачамі сучаснага літаратуразнаўства:

1) неабходнасцю сістэмна-комплекснага асэнсавання значэння асобы і творчасці Янкі Лучыны як аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры ў культурным кантэксце XIX стагоддзя;

2) важнасцю ўвядзення ў навуковы ўжытак дагэтуль невядомых або недаследаваных твораў Янкі Лучыны, якія з'яўляюцца значным здабыткам беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

## Сувязь працы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыя выканана на кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў адпаведнасці з навукова-даследчай тэмай «Беларуская літаратура XI–XIX стагоддзяў у міжкультурнай камунікацыі еўрапейскіх літаратур» (2016–2020, № 20162486).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта дысертацыі –** комплексна раскрыць спецыфіку творчасці Янкі Лучыны ў кантэксце ідэйна-мастацкага станаўлення і эвалюцыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

**Задачы даследавання:**

1) устанавіць агульнае і адметнае ў творчасці Янкі Лучыны як прадстаўніка беларускай літаратуры XIX стагоддзя, асэнсаваць характар уздзеяння індывідуальна-аўтарскіх творчых установак на галоўныя напрамкі развіцця новай беларускай літаратуры;

2) вызначыць ролю перакладчыцкай практыкі Янкі Лучыны ў развіцці беларускага паэтычнага перакладу, акрэсліць асноўныя перакладчыцкія прыёмы, выкарыстаныя пісьменнікам;

3) выявіць асаблівасці мадыфікацыі жанравых форм у паэзіі Янкі Лучыны, вылучыць асноўныя сэнсаўтваральныя матывы і найбольш значныя вобразы-сімвалы ў вершах паэта;

4) прааналізаваць узаемадзеянне разнастайных версіфікацыйных форм і сістэм вершавання ў паэзіі Янкі Лучыны, раскрыць рытма-інтанацыйную арганізацыю вершаваных структур у лірыцы паэта, істотных для станаўлення і развіцця культуры беларускага верша XIX стагоддзя;

5) ахарактарызаваць жанрава-стылёвую спецыфіку і мастацкую адметнасць паэмы «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся», паказаць прыкметнае значэнне твора Янкі Лучыны для станаўлення ліра-эпасу ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя;

6) прасачыць асаблівасці аповеду ў творах «З крывавых дзён» і «С праздничной поездки», абгрунтаваць плённы ўплыў мастацка-дакументальнага і падарожнага нарыса Янкі Лучыны на развіццё беларускай публіцыстыкі XIX стагоддзя.

**Аб’ект даследавання** – шматмоўная творчасць Янкі Лучыны: лірычныя, ліра-эпічныя, публіцыстычныя творы на польскай, беларускай, рускай мовах.

**Прадмет даследавання** – жанравая спецыфіка твораў, праблемна-тэматычнае поле, вобразна-матыўныя структуры тэкстаў, метрыка, рытма-інтанацыйная арганізацыя верша, паэтыка твораў Янкі Лучыны ў параўнальна-супастаўленчым аспекце.

**Навуковая навізна**

Упершыню комплексна разгледжана творчасць Янкі Лучыны на трох мовах – польскай, беларускай, рускай – у рэчышчы працэсаў ідэйна-эстэтычнага станаўлення і развіцця літаратуры Беларусі XIX стагоддзя. Выпраўлены тэксталагічныя недакладнасці ў выданнях твораў Янкі Лучыны.

Уведзены ў навуковы ўжытак дагэтуль невядомыя або недаследаваныя творы пісьменніка.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Янка Лучына адыграў значную ролю ў працэсе станаўлення і развіцця літаратуры Беларусі. Яго мастацкая спадчына ўяўляе сабой яскравы прыклад дыялогу культур, з'яўляецца феноменам культурнага памежжа. Пісьменнік паспяхова рэалізаваў патэнцыяльныя творчыя магчымасці ў полікультурнай і полілінгвістычнай прасторы. Улучэнне асобы і творчасці Янкі Лучыны ў шырокі гісторыка-літаратурны кантэкст (А. Міцкевіч, У. Сыракомля, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, В. Каратынскі, Т. Лада-Заблоцкі, В. Савіч-Заблоцкі, Ф. Савіч, А. Гурыновіч і інш.) дазваляе акрэсліць ролю і значэнне пісьменніка ў запачаткаванні і замацаванні галоўных тэндэнцый (сацыяльна-дэмакратычнай і рамантычнай) у развіцці славеснага мастацтва Беларусі, фарміраванні яго светапоглядных асноў і назапашванні эстэтычнага патэнцыялу. У творчасці Янкі Лучыны рэпрэзентаваны асноўныя ідэі, тэмы, вобразы і матывы, характэрныя для беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Творчасць Янкі Лучыны – сінтэз рамантычных і рэалістычных традыцый. Праўдзівае адлюстраванне побыту і жыцця народа ў шэрагу яго твораў суправаджаецца рамантычнай ідэалізацыяй вобраза беларуса, яго ўнутраных жаданняў і памкненняў («На затапельцаў», «Вясна» і інш.). Творчы метад Янкі Лучыны карэлюе з агульнай арыентацыяй літаратуры XIX стагоддзя на адлюстраванне жыццёвага і працоўнага ўкладу народа, яго маральных і духоўных асноў, на беларускі этнаграфізм, народную творчасць і інш.

2. Янка Лучына адыграў важную ролю ў станаўленні беларускага паэтычнага перакладу. Для літаратуры Беларусі істотнае значэнне маюць пераклады твораў Уладзіслава Сыракомлі. Пісьменнік выбіраў для перакладу творы, ідэйная накіраванасць якіх была блізкай яго арыгінальнай творчасці. Пры пераўвасабленні твораў Янка Лучына ўдала выкарыстаў шэраг мастацкіх прыёмаў (параўнанне, анафара, антытэза, паралелізм, антанімічны пераклад, эўфемізм, падаўжэнне або скарачэнне страфы, замена замежных нацыянальных рэалій айчыннымі). Перакладчыцкая дзейнасць Янкі Лучыны спрыяла ўзаемаўзбагачэнню суседніх літаратур, выхаванню патрыятызму, аказала ўплыў на арыгінальную творчасць пісьменніка.

3. Янка Лучына плённа распрацоўваў вершаваныя жанры, сваёй творчасцю спрыяў развіццю і ўзбагачэнню жанравай сістэмы паэзіі Беларусі XIX стагоддзя. Адметнасцю яго лірыкі з'яўляецца спалучэнне ў вершаваных творах розных жанравых прыкмет. Янка Лучына адыграў значную ролю ў станаўленні пейзажнай і філасофскай лірыкі. Творчасці паэта ўласцівы прыёмы

псіхалагізму, мастацкага паралелізму (арганічная сувязь паміж душэўным светам лірычнага героя і прыродай), алегарызм і сімволіка пейзажных вобразаў, з дапамогай якіх аўтар па-мастацку адметна ўвасабляў актуальныя, грамадска значныя ідэі, важныя сэнсы і пытанні быцця.

4. Янку Лучыну належыць значная роля ў развіцці версіфікацыйнай сістэмы беларускай лірыкі і культуры паэтычнай творчасці. Яго наватарства ў галіне вершавання яскрава выявілася ў польскамоўнай лірыцы. Адметнасцю версіфікатарскага майстэрства паэта з'яўляецца выкарыстанне розных вершаваных памераў і сістэм вершавання ў структуры аднаго твора. Характэрнай мастацка-выяўленчай рысай стылю Янкі Лучыны з'яўляецца зварот да прыёмаў паўтору і кантрасту (супрацьпастаўлення), што спрыялі ўзмацненню эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці і сэнсавага зместу паэтычнага тэксту.

5. Паэма Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» ўяўляе сабой арыгінальную, самабытную і ўнікальную з'яву ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя. Твор з'яўляецца ўзорам рэалістычнай абмалёўкі і паэтызацыі беларускай прыроды. Аўтар адметна паказаў сцэны палявання, увасобіў пейзажныя вобразы, удумліва асэнсаваў узаемаадносіны чалавека і прыроды. Вобраз Грышкі – новы і адметны псіхатып героя, у якім праявілася сутнасць нацыянальнага характару. Патрыятычная адданасць роднай зямлі, заклік да аховы прыроды, этыка адказнасці за чалавека, лёс суайчыннікаў і навакольны свет – вызначальныя рысы творчага метаду Янкі Лучыны як паэта-грамадзяніна і інтэлектуала-мысліцеля.

6. Мастацка-гістарычную каштоўнасць мае публіцыстычная спадчына Янкі Лучыны. Пісьменнік развіваў жанр мастацка-дакументальнага нарыса – «З крывавых дзён» і падарожнага нарыса – «С праздничной поездки», стварыў адметныя ў кампазіцыйна-змястоўным плане тэкставыя структуры. Звяртаючыся да актуальных грамадскіх праблем і значных гістарычных падзей, ён імкнуўся зацікавіць чытача сваёй удумліва-разважлівай інтанацыяй, уласнымі назіраннямі і думкамі, звяртаўся да найбольш прыдатных і эфектыўных мастацка-выяўленчых сродкаў (рытарычныя фігуры, лірычныя адступленні, прыёмы рэтраспекцыі, рэфлексіі і інш.).

**Асабісты ўклад аўтара**

Дысертацыйная работа з'яўляецца вынікам самастойнага даследавання. Упершыню асэнсавана роля асобы і творчасць Янкі Лучыны ў шырокім гісторыка-літаратурным кантэксце. Аўтарам дысертацыі прааналізаваны і сістэматызаваны навуковыя публікацыі замежных і айчынных навукоўцаў, прысвечаныя жыццю і творчасці Янкі Лучыны, пры гэтым выказаны ўласныя

погляды і меркаванні. Зроблены тэксталагічныя ўдакладненні ў публікацыях твораў і перакладаў пісьменніка. Сістэматызаваны і паглыблены аналіз навуковых праблем, што датычаць жыцця і творчасці Янкі Лучыны. Разгледжаны некаторыя дагэтуль невядомыя або недаследаваныя творы.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прайшлі апрабацыю ў выглядзе дакладаў і выступленняў на наступных канферэнцыях: 1) Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў «Экология человека и проблемы окружающей среды в постчернобыльский период»; Мінск, МДЭУ ім. А. Д. Сахарава, 11–12 ліст. 2010 г.; 2) Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Диалог культур: состояние межкультурных коммуникаций в условиях посткризисной экономики»; Санкт-Пецярбург, Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт кіравання і эканомікі, 18–19 крас. 2012 г.; 3) International scientific and practical conference «Dialogue of cultures: state of cross-cultural communications under conditions of post-crisis economy»; Saint-Petersburg, Saint-Petersburg university of management and economic, April 18–19, 2012.; 4) 69-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; Мінск, БДУ, 14–17 мая 2012 г.; 5) VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў; Мінск, БДУ, 22 ліст. 2012 г.; 6) Фальклор, гісторыя і літаратура беларусаў у кантэксце культурнай спадчыны славян: II Рэспубліканская студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя да 70-годдзя з дня нараджэння Ніны Мацяш; Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна, 22 кастр. 2013 г.; 7) Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Максім Багдановіч: дыялог з часам (асоба пісьменніка і яго творчасць у сусветным дыскурсе XX – XXI стст.)»; Мінск, Дзярж. музей гіст. беларус. літаратуры, 21 снеж. 2016 г.; 8) IV Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных «Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання», Мінск, БДУ, 17 сак. 2017 г.; 9) Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні; Гродна, ГрДУ імя Янкі Купалы, 24 ліст. 2017 г.; 10) V Міжнародныя Скарынаўскія навуковыя чытанні, прысвеч. 500-годдзю беларускага кнігадрукавання; Мінск, БДУ, 17–18 ліст. 2017 г.; 11) Міжнародныя навуковыя чытанні «Філаматы і філарэты: творчы лёс пакалення ў гісторыі і сучаснасці»; Мінск, НАН Беларусі, 13–14 снеж. 2017 г.; 12) Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі», прысвеч. 220-годдзю з дня нараджэння Адама Міцкевіча; Мінск, БДУ, 21–23 чэрв. 2018 г.

**Акт укаранення** ў навучальны працэс БДУ лекцыі «Лірыка Янкі Лучыны і Янкі Купалы: ідэйныя і вобразныя аналогіі» ад 30.05.2018 г. № 0304/857.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання выкладзены ў 26 публікацыях: 8 артыкулаў у навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК Беларусі (4,40 аўт. арк.), 1 артыкул у замежным навуковым выданні (0,78 аўт. арк.), 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац (0,96 аўт. арк.), 11 матэрыялаў навуковых канферэнцый (2,37 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 8,51 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя змяшчае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, 4 главы, заключэнне, спіс літаратуры (спіс выкарыстаных крыніц – 294 пазіцыі, спіс публікацый саіскальніка – 26 пазіцый), 1 дадатак. Агульны аб'ём дысертацыйнага даследавання – 160 старонак, асноўны тэкст займае – 129 старонак, спіс літаратуры – 24 старонкі, дадатак – 7 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У першай главе **«Асоба і творчасць Янкі Лучыны ў ацэнках крытыкі і літаратуразнаўства»** прааналізаваны крытычныя працы беларускіх і польскіх даследчыкаў, прысвечаныя жыццю і творчасці Янкі Лучыны (А. Ельскага, А. Свентахоўскага, А. Лянгэ, Ю. Навіньскага, І. Хшаноўскага, А. Драгашэўскага, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, Р. Зямкевіча, С. Майхровіча, А. Мальдзіса, М. Лазарука, С. Александровіча, У. Мархеля, М. Грынчыка, У. Вільчыньскага, М. Ларчанкі, А. Лойкі, Г. Кісялёва, У. Казберука, Г. Баркоўскай, Т. Зянькевіча, Л. Уладыкоўскай-Канаплянік і інш.).

У 1880–1890-я гг. польскія публіцысты ў асноўным лічылі Янку Лучыну паслядоўнікам Адама Міцкевіча і Уладзіслава Сыракомлі і трактавалі яго як правінцыйнага непрафесійнага пісьменніка. У 1900–1930-я гг. жыццё і творчасць Янкі Лучыны становіцца аб'ектам увагі і беларускіх даследчыкаў, якія падкрэслівалі ролю паэта ў станаўленні беларускай літаратуры і фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў. У 1940–1950-я гг. літаратуразнаўцы пачалі вывучаць біяграфію Янкі Лучыны і звяртаць увагу на мастацкі бок яго твораў. У акрэслены часавы адрэзак з'явілася першая манаграфія, прысвечаная жыццю і творчасці пісьменніка, аўтарам якой з'яўляецца С. Майхровіч. У 1953 г. выйшаў зборнік мастацкіх тэктстаў паэта – «Выбраныя творы». У 1960–1970-я гг. беларускімі даследчыкамі пачалі вывучацца і асэнсоўвацца польскамоўныя творы Янкі Лучыны. У гэты час былі адкрыты новыя факты з жыцця і творчасці пісьменніка: карэспандэнцыя, у якой

змяшчаліся некаторыя невядомыя да таго часу мастацкія творы; А. Мальдзісам быў выяўлены польскамоўны нарыс «З крывавых дзён». Упершыню аб’ектам увагі стала перакладчыцкая дзейнасць пісьменніка (У. Мархель, У. Вільчыньскі). Зроблена першая спроба разгляду майстэрства вершавання паэта (М. Грынчык). У 1980–1990-я гг. польскія даследчыкі пачалі разглядаць асобу Янкі Лучыны як прадстаўніка беларуска-польскага памежжа, быў выдадзены зборнік твораў пісьменніка, у які ўвайшлі вядомыя на той час арыгінальныя мастацкія тэксты, пераклады, лісты. У гэты перыяд з’явілася першае дысертацыйнае даследаванне, прысвечанае разгляду творчасці Янкі Лучыны ў аспекце фарміравання нацыянальнага светапогляду, аўтарам якога з’яўляецца Л. Уладыкоўская-Канаплянік (1993). У 2001 г. адбылася канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння Янкі Лучыны, і быў перавыдадзены зборнік твораў пісьменніка.

У другой главе **«Лірыка Янкі Лучыны ў кантэксце станаўлення беларускай паэзіі XIX стагоддзя»** разгледжана лірычная спадчына паэта, акрэслена яе месца і роля ў беларускай паэзіі XIX стагоддзя.

У раздзеле **2.1.1 «Асоба і творчасць Янкі Лучыны як феномен нацыянальнай літаратуры і культурнага памежжа»** прасочваецца роля і дзейнасць Янкі Лучыны ў развіцці культуры беларуска-польскага памежжа. Рысамі памежнага светабачання пісьменніка з’яўляюцца полілінгвістычнасць і полінацыянальнасць лірычнага героя, трактаванне славянскіх народаў як адной братэрскай супольнасці.

У раздзеле **2.1.2 «Роля і значэнне Янкі Лучыны ў станаўленні беларускага мастацкага перакладу»** аналізуецца перакладчыцкая дзейнасць пісьменніка. Перакладчыцкай стратэгіі Янкі Лучыны ўласціва выкарыстанне наступных прыёмаў: параўнанне, анафара, антытэза, паралелізм, эўфемізм, падаўжэнне або скарачэнне страфы, замена замежных нацыянальных рэалій айчыннымі. Роля перакладчыцкай практыкі Янкі Лучыны заключаецца ва ўзбагачэнні беларускай, польскай, рускай літаратур, узаемапрэзентацыі суседніх культур і выхаванні патрыятызму.

Раздзел **2.2 «Гісторыя публікацый вершаваных твораў Янкі Лучыны»** прысвечаны разгляду гісторыі выдання паэтычнай спадчыны пісьменніка. Беларуска- і рускамоўныя вершы Янкі Лучыны былі надрукаваны ў перыядычных выданнях «Минский листок», «Северо-Западный календарь», «Нёман», «Сялянская гутарка». Польскамоўныя вершы Янкі Лучыны з’явіліся ў перыядычных выданнях «Калоссе» («Kłosy»), «Жыццё» («Życie»), «Голас Польшчы» («Głos Polski»), «Усеагульны каляндар» («Kalendarz powszechny»), «Край» («Kraj») і яго дадатку «Літаратурны агляд» («Przegląd literacki»).

У раздзеле **2.3 «Жанравыя пошукі і паэтычнае наватарства Янкі Лучыны»** прасочваецца развіццё жанравай сістэмы ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. У лірычнай творчасці Янкі Лучыны часцей сустракаюцца вершы сінтэтычных жанраў. Найбольш распаўсюджаныя жанравыя спалучэнні: пейзажная і грамадзянская, пейзажная і інтымная, інтымная і філасофская лірыка. Паэт адыграў значную ролю ў распрацоўцы наступных жанравых форм: санет, серэнада, лірычная, ода, вершаваны ліст, верш-прысвячэнне, гутарка, калыханка, песня.

У раздзеле **2.4 «Янка Лучына і фарміраванне праблемна-тэматычнага поля беларускай паэзіі XIX стагоддзя»** падкрэсліваецца значэнне творчасці Янкі Лучыны ў развіцці ідэйна-тэматычнага і вобразна-змястоўнага аспектаў паэзіі XIX стагоддзя, якое заключаецца ў распрацоўцы прыродаапісальнай, сацыяльнай, філасофскай лірыкі, напаўненні вершаў вобразамі і матывамі, істотнымі для выражэння асноўнай ідэі (прырода, радзіма, чужына, праца, роздум).

У падраздзеле **2.4.1 «Погляды Янкі Лучыны на прызначэнне і ролю мастацтва»** аналізуюцца вершаваныя творы паэта, дзе выяўляецца думка паэта пра неабходнасць шчырага, сумленнага і адданага служэння мастака слова радзіме і народу, што аб'ядноўвае яго паэзію з творчасцю У. Сыракомлі, Т. Лады-Заблоцкага.

У падраздзеле **2.4.2 «Янка Лучына і станаўленне беларускай пейзажнай лірыкі»** адзначаецца роля паэта ў развіцці пейзажнага мыслення ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Найбольш значнымі вобразамі і матывамі ў прыродаапісальнай творчасці Янкі Лучыны з'яўляюцца паэтызацыя наваколля, супрацьпастаўленне радзімы і чужыны. Пейзажная лірыка Янкі Лучыны разгледжана ў кантэксце творчасці У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Т. Лады-Заблоцкага, В. Каратынскага, Я. Баршчэўскага, А. Міцкевіча, Я. Чачота, В. Савіча-Заблоцкага.

У падраздзеле **2.4.3 «Сацыяльная праблематыка творчасці Янкі Лучыны ў кантэксце станаўлення грамадзянскай паэзіі XIX стагоддзя»** аналізуюцца вершы, у якіх пісьменнік уздымае сацыяльную праблематыку. Падкрэслена ўвага паэта да вобраза селяніна, захапленне працоўным подзвігам народа, спачуванне нялёгкай долі беларусаў («На затапельцаў», «Роднай старонцы», «Што думае Янка, везучы дровы ў горад», «Што птушкі казалі» і інш.). Вобразы і матывы, характэрныя для лірыкі Янкі Лучыны сацыяльнай накіраванасці, увасоблены і ў творчасці Ф. Багушэвіча, У. Сыракомлі, Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Тапчэўскага, А. Гурыновіча, В. Савіча-Заблоцкага.

У падраздзеле **2.4.4 «Філасофскі дыскурс лірыкі Янкі Лучыны»** адзначаецца роля паэта ў запачаткоўванні і развіцці філасофскай лірыкі і інтэлектуалізму ў беларускай літаратуры. Падкрэслены філасафічнасць і медытатыўна-роздумны характар вершаў «Не хачу памерці…», «У пагоні за шчасцем», «Што люблю?», «Змрочныя думкі» і інш. Разважанне пра жыццё, шчасце, выяўленне сэнсава глыбокіх думак уласцівы таксама лірыцы А. Міцкевіча, У. Сыракомлі і іншых паэтаў XIX стагоддзя.

У падраздзеле **2.4.5 «Фальклорныя матывы і вобразы ў паэзіі Янкі Лучыны»** вылучаюцца асноўныя вобразы і матывы лірыкі Янкі Лучыны, што бяруць пачатак у фальклоры. Часта ў творчасці паэта выкарыстоўваецца прыём вобразна-псіхалагічнага паралелізму – суаднясенне стану прыроды і ўнутранага свету чалавека. Прыродныя з’явы і стыхіі ў творчасці пісьменніка ў алегарычнай форме ўвасабляюць сацыяльныя і грамадскія праблемы («Мароз», «Прадвесне», «Сівер», «Вясна»). Вершы паэта, напісаныя пад уплывам фальклору, супастаўлены з лірыкай В. Каратынскага, А. Гурыновіча, У. Сыракомлі, Я. Чачота, Ф. Багушэвіча.

У падраздзеле **2.4.6 «Лірычная паэзія Янкі Лучыны на тэму кахання: жанрава-эстэтычны аспект»** адзначаецца, што наватарства пісьменніка ў акрэсленым жанры выяўляецца ва ўвядзенні ў беларускую культуру літаратурнай серэнады («Серэнада»). У любоўнай паэзіі Янкі Лучыны прысутнічае матыў нешчаслівага кахання, уласцівы рамантычнай творчасці, у першую чаргу, спадчыне А. Міцкевіча.

У раздзеле **2.5 «Спецыфіка вершавання ў беларускай паэзіі XIX стагоддзя і версіфікатарскае майстэрства Янкі Лучыны»** прасочваецца працэс станаўлення сістэмы беларускага вершавання і вызначаецца роля Янкі Лучыны ў ім. Адзначаецца ўплыў рускай і польскай літаратур, а таксама фальклорнай творчасці на развіццё беларускай версіфікацыйнай сістэмы.

У падраздзеле **2.5.1 «Метрычны рэпертуар польскамоўных вершаў Янкі Лучыны»** даследуецца версіфікатарскае майстэрства паэта на польскай мове. У польскамоўнай лірыцы наватарства Янкі Лучыны заключаецца ў значнай перавазе сілаба-танічнай сістэмы і выкарыстанні мужчынскай рыфмы. Для версіфікацыйнай сістэмы Янкі Лучыны характэрна спалучэнне розных памераў і сістэм вершавання ў адным творы. Паэт прыкладна з аднолькавай частотнасцю карыстаўся як двух-, так і трохскладовымі памерамі. Сярод двухскладовых памераў значна пераважае харэй, што тлумачыцца ўплывам фальклору і імкненнем зрабіць успрыманне верша больш лёгкім.

У падраздзеле **2.5.2 «Метрычны рэпертуар беларускамоўных вершаў Янкі Лучыны»** разглядаецца версіфікатарскае майстэрства паэта на

беларускай мове. У беларускамоўнай спадчыне Янкі Лучыны таксама пераважае сілаба-танічная сістэма вершавання. У большасці вершаваных твораў Янка Лучына ўжыў перакрыжаваную рыфмоўку і жаночую рыфму. Пры параўнанні частотнасці выкарыстання двух- і трохскладовых памераў значна пераважаюць двухскладовыя, а сярод іх – харэй. У беларускамоўнай лірыцы Янка Лучына выкарыстаў танічную сістэму вершавання.

У падраздзеле **2.5.3 «Метрычны рэпертуар рускамоўных вершаў Янкі Лучыны»** даследуецца версіфікатарскае майстэрства паэта на рускай мове. Усе вершы напісаны ў сілаба-танічнай сістэме, спалучаны перакрыжаванай рыфмоўкай. Характэрнай асаблівасцю рускамоўнага вершавання Янкі Лучыны з'яўляецца тое, што ў вершах жаночая рыфма чаргуецца з мужчынскай.

У раздзеле **2.6 «Узбагачэнне рытміка-інтанацыйных структур у паэзіі Янкі Лучыны і яго роля ў развіцці беларускага верша»** вылучаны рытміка-інтанацыйныя кампаненты, уласцівыя паэзіі Янкі Лучыны: вар'іраванне колькасці складоў, адметны паэтычны сінтаксіс (паўторы, падваенне, лексічная і сінтаксічная анафара, рэфрэн, ампліфікацыя, паралелізм, шматпрыназоўнікавасць, шматзлучнікавасць, бяззлучнікавасць, рытарычныя фігуры, гукапіс).

У трэцяй главе **«Паэма Янкі Лучыны "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся" і станаўленне ліра-эпасу ў XIX стагоддзі»** разгледжана паэма Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся», вылучаны агульныя вобразы і матывы, што аб'ядноўваюць твор Янкі Лучыны з паэмамі Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», Уладзіслава Сыракомлі «Улас», Вінцэнта Каратынскага «Таміла», Артура Бартэльса «Дзяніскавічы».

У раздзеле **3.1 «Гісторыя стварэння і публікацыі паэмы "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся", аўтабіяграфізм твора»** прасочваецца гісторыя стварэння і выдання паэмы, параўнаны тэксты першапублікацый, рукапісаў і канчатковага варыянта, акрэслена жанравая прыналежнасць твора (апісальная і дыялагічная паэма, некаторыя часткі маюць дыдактычныя прыкметы), выяўлены аўтабіяграфічныя рысы, вызначаны хранатоп паэмы (час дзеяння – другая палова XIX стагоддзя, месца дзеяння – наднёманская пушча).

У раздзеле **3.2 «Асаблівасці кампазіцыі паэмы "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся"»** адзначаецца, што ў творы аповед вядзецца ад першай асобы. Галоўны апавядальнік твора – паніч, які распавядае пра асобныя эпізоды з палявання. Некалькі разоў ужываецца прыём «аповед у аповедзе». Кожная частка мае асобны сюжэт, не звязаны з падзеямі іншых урыўкаў.

У раздзеле **3.3 «Адметнасць вобраза Грышкі – галоўнага героя паэмы "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся"»** аналізуецца спецыфіка вобраза

галоўнага героя твора – Грышкі. Паэт падае яго дынамічны партрэт. Вобраз Грышкі – вынік спалучэння Янкам Лучынам аб’ектыўных назіранняў і ўласных суб’ектыўных ацэнак. Адзначаны асаблівасці тыпізацыі вобраза героя і наяўнасць у яго асобе і паводзінах рыс нацыянальнага характару беларуса.

У раздзеле **3.4 «Мастацкае выяўленне прыроды як асобнага героя паэмы “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”»** падкрэсліваецца непарыўная сувязь чалавека з прыродай. Пушча з’яўляецца асобным героем твора. Пісьменнік гіпербалізуе і адухаўляе лясныя расліны. Янка Лучына першы ў беларускай літаратуры ўзняў экалагічную праблему (ад імя героя твора ён выступаў супраць умяшання ў першародны прыродны свет).

У раздзеле **3.5 «Нацыянальны каларыт паэмы “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся” і спецыфіка паказу паляўнічых традыцый»** аналізуюцца беларусізмы або правінцыялізмы, большасць з якіх абазначае нацыянальныя рэаліі, і спосаб іх аўтарскай рэпрэзентацыі. Прыводзяцца звесткі з рукапісаў паэмы, што датычаць асаблівасцей паводзін некаторых жывёл і палявання на іх. Рэчыўна-прадметны свет у творы прадстаўлены ў першую чаргу атрыбутамі паляўнічых.

У чацвёртай главе **«Роля Янкі Лучыны ў станаўленні і развіцці публіцыстыкі XIX стагоддзя»** разгледжаны публіцыстычныя творы пісьменніка, вызначана іх месца і роля ў кантэксце беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

У раздзеле **4.1 «Публіцыстыка Янкі Лучыны ў літаратурным кантэксце і грамадскім дыскурсе XIX стагоддзя»** адзначаецца, што пісьменнік таленавіта праявіў сябе ў асноўных жанравых формах публіцыстыкі (мастацка-дакументальны і падарожны нарыс, інфармацыйная нататка).

У раздзеле **4.2 «Нарыс “З крывавых дзён”: праблематыка, кампазіцыя, мастацкія асаблівасці»** даследуюцца польскамоўныя нарысы, што ўвайшлі ў вышэйзгаданую кнігу. Прыводзяцца звесткі пра яе выданне. Асноўнымі ідэйна-праблемнымі блокамі ў творы з’яўляюцца імкненне да свабоды, згуртаванасць народа, класавы падзел грамадства, нацыянальны прыгнёт, неадукаванасць народа, заклік да выканання праграмы польскага пазітывізму («praca organiczna» і «praca u podstaw»). У нарысе «З крывавых дзён» Янка Лучына ўзгадвае вядомыя гістарычныя факты, якія пэўным чынам звязаны з падзеямі паўстання. Твор мае асноўныя сюжэтныя элементы (экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка, эпілог). Значную ролю ў творы Янка Лучына надае мастацкай дэталі, з дапамогай якой падкрэслівае пэўную рысу ці факт рэчаіснасці. Прыкметную ролю Янка Лучына надае пейзажу, які выконвае ў першую чаргу сімвалічную і псіхалагічную

функцыі. Нарыс прасякнуты героіка-рамантычным пафасам. Цэнтральнымі вобразамі ў творы з’яўляюцца паўстанне, Польшча, паўстанцы, царскія ўлады. Янка Лучына адухаўляе паўстанне і персаніфікуе Польшчу. Пісьменнік прысутнічае ў творы адразу ў некалькіх ролях: аўтар, прыхільнік паўстання, незалежны аналітык, патрыёт. Нарыс Янкі Лучыны параўноўваецца з творамі К. Каліноўскага і Э. Ажэшка.

У раздзеле **4.3 «Нарыс “С праздничной поездки”: праблематыка, кампазіцыя, мастацкія асаблівасці»** вылучаецца цэнтральная праблема твора – тэхнічны прагрэс. Твор мае лірычны характар, у ім адсутнічае сюжэт. Галоўная задача аўтара – паказаць наваколле і выказаць думкі, якія ўзніклі пад уражаннем наведвання пэўнай мясцовасці. У нарысе прысутнічае вясковы і гарадскі пейзаж. Аповед вядзецца ад першай асобы, бо аўтар з’яўляецца сведкам падзей. У нарысе прысутнічаюць аўтарскія адступленні, якія даюць магчымасць больш дакладна зразумець значнасць чыгункі і цягніка як сімвалаў новага этапу грамадска-эканамічнага развіцця ў жыцці мясцовага насельніцтва.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Фарміраванне светапогляду Янкі Лучыны, яго пісьменніцкай індывідуальнасці ўяўляе сабой адметны і ўнікальны феномен культуры памежжа. Паэт належыць да дзеячаў польска-беларускага літаратурнага памежжа, такіх як А. Міцкевіч, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, Т. Зан, А. Ходзька, А. Адынец, А. Пшчолка, В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, А. Рыпінскі, В. Каратынскі, А. Гурыновіч, Т. Лада-Заблоцкі, Э. Ажэшка, Ф. Багушэвіч і інш. Вызначальнымі рысамі культуры памежжа, якія знайшлі ўвасабленне ў творчасці Янкі Лучыны, з’яўляюцца:

- полілінгвізм (напісанне твораў на некалькіх мовах, што ўяўляюць сабой цэласнасць і літаратурна-мастацкае адзінства, выкарыстанне беларусізмаў у польскамоўных творах і паланізмаў у беларускамоўных творах);
- поліэтнічнасць героя (выступленне ў розных творах ад імя беларуса-селяніна, ад імя польскай шляхты, ад імя польскай супольнасці ў Мінску);
- супрацьпастаўленне радзімы чужыне праз апазіцыю «сваё – чужое»;
- выкананне ролі спалучальнага звяна паміж літаратурамі суседніх народаў праз мастацкія пераклады рускамоўных пісьменнікаў на польскую мову, польскамоўных пісьменнікаў – на рускую і беларускую мовы;
- памежнае светабачанне (трактаванне ўсіх славянскіх нацый як адзінай вялікай супольнасці, аб’яднанай агульнай гісторыяй, падобнымі мовамі і

культурамі, што суправаджаецца ўсведамленнем існавання асобных нацый і вылучэннем іх сярод іншых).

Творчасць Янкі Лучыны рэпрэзентавана актуальнымі эстэтычнымі мэтамі, арыгінальнымі ідэямі, каштоўнасцямі новага часу, багаццем тэм, вобразаў і матываў. Паэт у пэўным сэнсе выступае як тэарэтык літаратуры і мастацтва, ускосна выказваючы меркаванне аб тым, што мастацтва здольна звярнуць увагу на актуальныя жыццёвыя пытанні і аб’яднаць людзей для іх вырашэння. Для Янкі Лучыны творчасць не толькі з’яўляецца выражэннем праблем народа, але таксама служыць сродкам для разумення яго жыцця, спосабам пранікнення ў псіхалогію сялян. Лірычныя творы паэта ўяўляюць сабой паказ штодзённага жыцця чалавека, тым самым набліжаюць прадстаўнікоў шляхты да спасціжэння народнай мудрасці.

Тэматычная разнастайнасць, глыбіня ідэйна-мастацкага зместу, багацце вобразаў і матываў лірычнай спадчыны Янкі Лучыны выяўляецца ў наступных тэматычных блоках, якія ў параўнальна-кантэкстуальным аспекце дазваляюць паставіць творчасць паэта ў адзін шэраг з іншымі пісьменнікамі:

- роздум наконт прызначэння творчасці, заклік да паэтаў ствараць вершы для народа і ўздымаць актуальныя праблемы з жыцця грамадства, пошук прычын памяншэння папулярнасці паэзіі (У. Сыракомля, А. Міцкевіч, Т. Лада-Заблоцкі, Ф. Багушэвіч);
- супрацьпастаўленне радзімы і чужыны, сум па радзіме на чужыне, захапленне прыродай на радзіме і на чужыне (У. Сыракомля, Т. Лада-Заблоцкі, В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Баршчэўскі, А. Міцкевіч, Я. Чачот, В. Савіч-Заблоцкі, Ф. Багушэвіч);
- павага да селяніна, падзяка за яго плённую працу, спачуванне яму з прычыны сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту (Ф. Багушэвіч, У. Сыракомля, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Тапчэўскі, В. Каратынскі, А. Гурыновіч, В. Савіч-Заблоцкі, Ф. Савіч);
- роздум пра месца чалавека ў свеце, пошукі шчасця (А. Міцкевіч, Ф. Багушэвіч, Т. Лада-Заблоцкі);
- выяўленне сацыяльных з’яў праз вобразы і з’явы прыроды (В. Каратынскі, А. Гурыновіч, У. Сыракомля, А. Вярыга-Дарэўскі, З. Тшашчкоўская, Я. Чачот);
- стварэнне вершаў, стылізаваных пад фальклорныя творы (Я. Чачот, Ф. Багушэвіч і інш.);
- расчараванне і сум з-за нешчаслівага кахання (А. Міцкевіч).

Янка Лучына адгукнуўся на культурны выклік беларускага народа, спрыяў нацыянальнаму абуджэнню і ўздыму яго пасіянарных сіл. Заслугай

пісьменніка з’яўляецца зварот на новым этапе да беларускай рэчаіснасці, арганічная спалучанасць з народным жыццём, увага ў літаратурнай творчасці да мінулага, актыўнасць грамадзянскай думкі і яе скіраванасць у будучыню беларусаў. Гэта быў несумненны творчы лідар з яскрава выяўленымі дэмакратычнымі поглядамі.

Творчасць Янкі Лучыны стала значным укладам у станаўленне і развіццё мастацкіх сістэм у літаратуры Беларусі XIX стагоддзя. Адметнасцю яго творчасці з’яўляецца перапляценне рэалістычных і рамантычных традыцый. Янка Лучына, як і А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, Я. Чачот і іншыя пісьменнікі-рамантыкі, лічыў народную творчасць крыніцай і асновай мастацтва.

Павышаная ўвага да народа як аб’екта мастацкага пазнання характэрна для эпох рамантызму, пазітывізму і рэалізму. Янка Лучына працягваў рамантычныя традыцыі, аднак у паказе і ўвасабленні рэчаіснасці ён аддаваў перавагу рэалістычным прынцыпам і сродкам. У творчасці Янкі Лучыны выяўляецца праўдзівы паказ народнага жыцця прадстаўнікоў сацыяльных нізоў, што часам дапаўняецца рамантычным захапленнем постаццю селяніна-працаўніка. Паэт стварыў рэалістычны вобраз беларуса канца XIX стагоддзя. Побыт беларускага селяніна Янка Лучына зрабіў прадметам эстэтызацыі [3; 6; 14; 17; 18; 20; 21; 22; 25].

2. Янка Лучына выконваў як вольныя, так і адэкватныя пераклады паэтычных твораў. Пісьменнік меў асаблівы падыход да выбару перакладаемых твораў, ён кіраваўся ў першую чаргу ідэйнай адпаведнасцю арыгінала яго ўласным творчым поглядам. Янка Лучына з’яўляецца першым перакладчыкам твораў Уладзіслава Сыракомлі на беларускую мову. Перакладчыцкая праца пісьменніка спрыяла ўзбагачэнню беларускай, польскай, рускай літаратур, садзейнічала прэзентацыі літаратур суседніх народаў у беларускай культурнай прасторы. Яго творчая дзейнасць прыкметна паўплывала на станаўленне мастацкага перакладу ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Перакладчыцкаму метаду Янкі Лучыны ўласціва напаўненне перакладаемага твора ўласнымі мастацкімі прыёмамі, перастварэнне вобразаў, скасаванне радкоў, якія не раскрываюць ідэйны змест твора. У некаторых выпадках пры пераўвасабленні твора перакладчыку спатрэбілася замена замежных нацыянальных рэалій асаблівасцямі рэчаіснасці краіны, на мову якой выконваўся пераклад. Перакладчыцкая дзейнасць пісьменніка ўзбагачала яго арыгінальную творчасць, а таксама выконвала выхаваўчую функцыю – дапамагала ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў, развівала патрыятычныя памкненні [3; 24].

3. Янка Лучына ўзбагаціў жанравую сістэму беларускай паэзіі, пашырыў яе вобразна-тэматычныя межы. У лірычных творах паэт спалучаў рысы розных жанраў і мастацкіх сістэм, ён падаваў прыклад таго, як абнавіць і пашырыць сістэму мастацка-выяўленчых прыёмаў і сродкаў.

Сярод паэтычнай спадчыны Янкі Лучыны большасць вершаў немагчыма аднесці да той ці іншай жанравай разнавіднасці ў чыстым выглядзе. Часцей сустракаюцца вершы, дзе паэт сінтэзуе жанры, што сведчыць пра яго несуменны талент. У паэтычнай творчасці Янкі Лучыны пераважае грамадзянская лірыка. Ён з'яўляецца адным з пачынальнікаў беларускай пейзажнай лірыкі, у сваіх прыродаапісаннях паэт адкрываў хараство і адметнасць нацыянальнай карціны свету, паглыбляў вобразна-мастацкае мысленне. Паэту ўласціва тонкае пранікненне ва ўнутраны свет лірычнага героя. Вельмі часта сустракаецца паралель паміж душэўным станам героя і прыродай. Шэраг вершаваных твораў Янкі Лучыны вылучаецца рысамі філасафічнасці і інтэлектуалізму. Лірычны герой яго твораў задумваецца на тэму шчасця, жыцця і смерці, разважае пра лёс народа. Найвышэйшая ступень шчасця для яго – арганічнае зліццё з радзімай і яе лёсам.

Найчасцей паэт спалучаў грамадзянскую і пейзажную лірыку, выяўляючы тым самым непарыўную духоўную сувязь чалавека, радзімы, прыроды, народа. Многія вобразы і матывы ў паэзіі Янкі Лучыны маюць фальклорнае паходжанне ці сувязь з вуснапаэтычнай традыцыяй (напрыклад, вобразы прыродных стыхій). Асаблівасцю многіх паэтычных твораў стала паглыбленне ў іх лірычнага пачатку і псіхалагізму. Найменшае месца ў колькасных адносінах у лірыцы паэта займаюць творы пра каханне.

Дасягненне Янкі Лучыны ў распрацоўцы жанравых форм заключаецца ў развіцці наступных жанраў: санет («Віняры»), серэнада («Серэнада»), лірычная паэма («З гісторыі жыцця і песні»), ода («На юбілей Ажэшчыхі»), вершаваны ліст («Браце мой і таварыш!»), («Пане Аляксандар!»), верш-прысвячэнне («Лірнік вясковы», «Усёй трупе дабрадзея Старыцкага беларускае слова», «Дабрадзею артысту Манько», «По поводу 100-летней годовщины дня рождения лорда Байрона», «Джюбелини-Ряднoвой в память бенефиса 22 февраля в Минске в 1891 г.»), гутарка («Што птушкі казалі»), элегія («На могілках», «Заходзіць сонца за горы…»), калыханка («Калыханка»), песня («Песня аратая», «Вісла»).

Творчасць Янкі Лучыны спрыяла пашырэнню жанрава-тэматычнай разнастайнасці паэзіі, суб'ектыўнай выяўленчасці, узбагачэнню пачуццёвага і духоўнага свету беларускага верша, паклала пачатак інтэлектуальна-філасофскага кірунку ў беларускай паэзіі [4; 8; 9; 10; 11; 13; 15; 19; 23].

4. У літаратуры XIX стагоддзя Янка Лучына прыкметна ўзняў культуру верша, узровень паэтычнага майстэрства. Наватарствам паэта ў галіне вершавання з’яўляецца стварэнне параўнальна вялікай колькасці вершаў на польскай мове ў сілаба-танічнай сістэме. Імкненне да збліжэння верша з фальклорнымі традыцыямі матывавала перавагу сілаба-танічнай сістэмы ў паэзіі Янкі Лучыны. Ён актыўна звяртаўся да мужчынскай рыфмы, якая ў XIX стагоддзі ў польскамоўнай паэзіі была рэдкай з’явай.

На сістэму вершавання паэта зрабілі ўплыў тры літаратуры і тры вершаваныя сістэмы: руская літаратура (сілаба-танічная сістэма), польская літаратура (сілабічная сістэма), беларуская літаратура (танічная сістэма). Апрача гэтага, Янка Лучына дасканала валодаў старажытнагрэчаскай, французскай і нямецкай мовамі, што дазволіла яму знаёміцца з вершаванымі тэкстамі на гэтых мовах і арыентавацца на іх узоры.

Большасць вершаў Янкі Лучыны складаецца з чатырохрадковых строф, крыху радзей паэт падзяляў вершы на актэты, дзесяці- і дванаццаціградкоўі. Некаторыя вершы аднастрофныя. Многія вершы маюць непастаянны або свабодны падзел на строфы. Вельмі рэдка ў паэзіі Янкі Лучыны сустракаюцца секстэты і септымы. У некаторых вершах паэт сінтэзаваў розныя вершаваныя памеры і сістэмы вершавання, што вынікала з неабходнасці выяўлення розных думак у адным вершы. Янка Лучына прыкладна ў аднолькавай ступені карыстаўся двух- і трохскладовымі памерамі, сярод двухскладовых памераў пераважае харэй, сярод трохскладовых значнай перавагі пэўных памераў не назіраецца.

Асаблівасць рытма-інтанацыйнага ладу лірыкі Янкі Лучыны заключаецца ў шырокім выкарыстанні разнастайных паўтораў і гукапісу, што набліжала яго паэзію да народнай творчасці і садзейнічала ўзмацненню ўражання, выкліканага прачытаннем твора. Паэт клапаціўся пра лёгкасць успрымання і запамінання чытачом вершаваных твораў [5].

5. Паэма Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» ў кантэксце польскай і беларускай літаратур з’яўляецца цалкам новай і адметнай мастацкай з’явай. У творы намаляваны сцэны палявання, паказаны пейзажна-ландшафтны свет, асэнсаваны ўзаемаадносіны чалавека і прыроды. У паэтызацыі прыроды, яе хараства пісьменнік працягваў традыцыі А. Міцкевіча, аўтара «Пана Тадэвуша». У літаратуры Беларусі паэма Янкі Лучыны мае ўнікальнасць праз наяўнасць самабытных карцін прыроды, адлюстраванне нацыянальнага свету і рэчаіснасці. Прырода паўстае ў творы як асобны герой. Пейзаж у паэме, акрамя абазначэння месца дзеяння, выконвае эстэтыка-выхаваўчую функцыю. Герой,

які пражыў усё жыццё на ўлонні прыроды, з'яўляецца ўзорам павагі да яе багаццяў і скарбаў.

Янка Лучына першы ў беларускай літаратуры ўзняў праблему аховы прыроды, выкліканую тэхнічным прагрэсам. Вуснамі Грышкі, галоўнага героя твора, паэт асуджае імкненне да нажывы за кошт сродкаў прыроды. Пагрозу навакольнаму асяроддзю ляснік успрымае як пагрозу свайму жыццю. Стан, лёс і будучыня прыроды так моцна хвалююць Грышку, бо ён жыве ў гармоніі і суладдзі з ёй, з'яўляючыся прыкладам арганічнага зліцця з навакольным асяроддзем. Паляўнічы не ўяўляе сябе асобна ад прыроды, бо выхаваны на яе ўлонні, яна для яго і маці, і дом, і школа жыцця.

На прыкладзе Грышкі Янка Лучына выявіў найбольш характэрныя, сутнасныя рысы нацыянальнага менталітэту. Мастацкая задача паэта заключалася ў тым, каб сцвердзіць ідэю пра існаванне беларусаў як асобнай самастойнай нацыі і выклікаць цікавасць да жыцця сваіх землякоў – Янка Лучына яе паспяхова рэалізаваў.

Янка Лучына ідэалізуе Грышку, але надзяляе героя як станоўчымі (пашана да прыроды, цудоўныя паляўнічыя здольнасці, веданне народнай мудрасці, гаспадарлівасць, непахіснасць, смеласць), так і адмоўнымі рысамі (прымхлівасць, імкненне часам пахваліцца, кансерватызм). У тэксце паэмы падрабязна апісваюцца прылады працы і палявання, зброя, адзенне, хата, ежа – што ставарае нацыянальны каларыт твора і паказвае адметнасць побыту беларусаў [2; 12; 16; 26].

6. Каштоўнасць уяўляе публіцыстычная спадчына Янкі Лучыны. Пісьменнік сваёй творчасцю зрабіў прыкметны ўплыў на станаўленне і развіццё публіцыстычных жанраў у літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзя. У нарысе «З крывавых дзён» Янка Лучына спалучыў рысы мастацкага і дакументальнага нарыса, ён праўдзіва адлюстраваў падзеі паўстання 1863 года і зрабіў вызваленчы рух прадметам ідэйна-мастацкага асэнсавання, паказаў неадназначнае стаўленне да падзей. Пісьменнік здолеў паказаць вызваленчы рух з розных бакоў. З аднаго боку, мужнасць удзельнікаў вызваленчага руху і іх вернасць сваёй справе, з іншага – неадназначнае стаўленне пэўнай часткі насельніцтва да паўстання, што і перашкодзіла перамозе.

Янка Лучына выкарыстаў у нарысе метад абагульнення: «Партызанская акцыя ў мінскім ваяводстве, гэта ўсяго толькі маленькі эпізод гераічнай барацьбы, што вялася на цэлай прасторы польскіх зямель пад расійскім захопам» [1] – на прыкладзе эпізоду пра паўстанне на Міншчыне пісьменнік

[1] Z krwawych dni: epizod z powstania 1863 r. w Mińskiem / opowiedziany przez *S. – Kraków: Skład główny w księgarnii S. A. Krzyżanowskiego, 1889. – S. 39.

стварыў у чытачоў яскравае ўяўленне аб нацыянальна-вызваленчым руху не толькі на беларускай тэрыторыі, але і на землях былой Рэчы Паспалітай. У творы выкарыстаны таксама прыёмы рэтардацыі, дэталізацыі, паралелізму. Пісьменнік разгледзеў праблемы, якія сталі перашкодай для перамогі ў паўстанні, і падвёў вынікі вызваленчага руху.

У кантэксце беларускай публіцыстыкі нарыс Янкі Лучыны «З крывавых дзён» можна лічыць наватарскім: у ім паказана самая значная гістарычная падзея, якая паўплывала на лёс беларусаў і палякаў. Роля нарыса для беларускай літаратуры праяўляецца ў тым, што, акрамя падзей вызваленчага руху, у ім закранаюцца шматлікія грамадскія праблемы. Пісьменнік звярнуўся ў творы да самых значных актуалій і грамадскіх праблем (неадукаванасць народа, сацыяльнае расслаенне грамадства і г. д.). Стварэнне нарыса на польскай мове садзейнічала таму, што пытанні, узнятыя ў ім, былі данесены да шырокага кола чытачоў.

У нарысе «С праздничной поездки» закранаецца праблема тэхнічнага прагрэсу і яго адмоўных бакоў. Тып аповеду ў гэтым творы – лірычны, у ім адсутнічае сюжэт. Пісьменнік дэманструе суб’ектывізаваны стыль пісьма, звяртаецца да прыёмаў рэфлексіі і рэтраспекцыі (развагі і ўспаміны). Янка Лучына ўслед за Уладзіславам Сыракомлем, Аляксандрам Ельскім і іншымі пісьменнікамі стаяў ля вытокаў і плённа развіваў традыцыі падарожнага нарыса [1; 7].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання

Вынікі працы могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы курсаў па гісторыі беларускай літаратуры, спецкурсаў, пры напісанні курсавых і дыпломных работ, у практыцы выкладання беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі і педкаледжах. Матэрыялы, атрыманыя ў працэсе даследавання, стануць падставай для стварэння манаграфіі пра жыццё і творчасць Янкі Лучыны, падрыхтоўкі новага пакалення вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, складання першага поўнага збору твораў Янкі Лучыны. Новыя тэксты пісьменніка, выяўленыя ў час архіўных і даследчых пошукаў, паспрыяюць узбагачэнню гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя, яе фsvg фактылогіі. Звесткі з біяграфіі Янкі Лучыны, у тым ліку і яго кантакты з іншымі дзеячамі беларускай і польскай культур, пашыраць уяўленне пра дзейнасць творцы, а таксама могуць дапамагчы ў адкрыцці невядомых біяграфічных фактаў і мастацкіх твораў іншых літаратараў.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

## Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК Беларусі, і замежных выданнях


1. Круглова, В. Невядомы Янка Лучына / В. Круглова // Полымя. – 2016. – № 7. – С. 134–144.

2. Круглова, В. В. Творчасць Янкі Лучыны: новыя аспекты вывучэння / В. В. Круглова // Беларус. мова і літ. – 2017. – № 2. – С. 48–55.

3. Круглова, В. Феномен культурнага памежжа і творчасць Янкі Лучыны / В. Круглова // Роднае слова. – 2017. – № 11. – С. 6–10.

4. Круглова, В. В. Канцэптуальныя погляды Янкі Лучыны на прызначэнне і ролю мастацтва / В. В. Круглова // Вестник МГЛУ. Сер.: 1: Филология. – 2017. – № 6. – С. 118–125.

5. Круглова, В. В. Узбагачэнне рытміка-інтанацыйных структур у паэзіі Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Вестник БарГУ. – Сер.: Педагогические науки. Психологические науки. Филологические науки (литературоведение). – 2018. – Вып. 6. – С. 111–118.

6. Круглова, В. В. Асоба і творчасць Янкі Лучыны ў кантэксце беларускай літаратуры XIX стагоддзя / В. В. Круглова // Нар. асвета. – 2018. – № 6. – С. 92–96.

7. Kruglova, O. Szkic Jana Niesłuchowskiego (Janki Łuczyny) *Z krwawych dni*: właściwości artystyczne i problematyka / O. Kruglova // Acta Albaruthenica. – T. 18. – Warszawa, 2018. – S. 135–147.

8. Круглова, В. В. Філасофская парадыгма творчасці Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. – Сер. А: Гуманітарныя навукі: Гісторыя. Філасофія. Філалогія. – 2018. – № 2 (52). – С. 88–93.

9. Круглова, В. В. Янка Лучына і станаўленне пейзажнага мыслення ў беларускай паэзіі / В. В. Круглова // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. – Сер. 3: Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2018. – Т. 8. – № 3. – С. 6–14.


## Артыкулы ў зборніках навуковых работ


10. Круглова, В. В. Народна-песенныя матывы ў польскамоўнай паэзіі Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. навук. арт. Вып. 10 / пад навук. рэд. В. В. Прыемка, Т. В. Лук’янавай. – Мінск: РІВШ, 2014. – С. 176–179.

11. Круглова, В. В. Парэміі ў паэзіі Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Мова і культура: зб. навук. артыкулаў / рэдкал.: В. М. Касцючык [і інш.]; пад агул. рэд. Л. В. Леванцэвіч. – Мінск: РІВШ, 2014. – С. 117–119.

12. Круглова, В. В. Міфалагічны кампанент у светапоглядзе Грышкі – галоўнага героя паэмы Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» /

В. В. Круглова // Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. навук. арт. Вып. 12 / пад навук. рэд. Т. В. Лук’янавай, С. В. Шамякінай; уклад. В. В. Прыемка. – Мінск, 2015. – С. 136–140.

13. Круглова, В. В. Ідэйна-мастацкі дыскурс польскамоўнай паэзіі Янкі Лучыны / В. В. Круглова, В. П. Рагойша // Сборник научных работ студентов Республики Беларусь «НИРС 2014» [редкол.: В. А. Богуш (предс.) и др.]. – Минск, 2015. – С. 418.

14. Круглова, В. В. Фальклор у творчасці Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. навук. арт. Вып. 14 / рэдкал.: В. П. Рагойша (старш.) [і інш.]; пад навук. рэд. В. В. Прыемка, Т. А. Марозавай. – Мінск: РІВШ, 2018. – С. 157–164.

15. Круглова, В. Паэзія Янкі Лучыны і Янкі Купалы: параўнальна-тыпалагічны аспект / В. Круглова // Маладая плынь: навук. і літ. альманах каф. гіст. беларус. літ. БДУ. Вып. 1 / рэдкал.: А. Бельскі (гал. рэд. і ўклад.) [і інш.]. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2019. – С. 19–30.

**Матэрыялы канферэнцый**

16. Круглова, В. В. Фарміраванне эстэтыка-экалагічнага ідэалу грамадства праз творы беларускай літаратуры / В. В. Круглова // Экология человека и проблемы окружающей среды в постчернобыльский период: материалы междунар. науч. конф. молодых ученых, аспирантов, магистрантов, студентов; Минск, 11–12 нояб. 2010 г. / МГЭУ им. А. Д. Сахарова; под общ. ред. С. Б. Мельнова, С. С. Позняка. – Минск, 2011. – С. 167–168.

17. Kruglova, O. Yanka Luchina’s creativity as an example of cross-cultural interaction / O. Kruglova // International scientific and practical conference “Dialogue of cultures: state of cross-cultural communications under conditions of post-crisis economy”. Saint-Petersburg, April 18–19, 2012. Collection of scientific papers of the conference. – Saint-Petersburg, 2012. – P. 278–282.

18. Круглова, О. В. Творчество Янки Лучины как пример межкультурного взаимодействия / О. В. Круглова // Международная научно-практическая конференция «Диалог культур: состояние межкультурных коммуникаций в условиях посткризисной экономики»; Санкт-Петербург, 18–19 апр. 2012 г.: сб. науч. трудов конф. – Санкт-Петербург, 2012. – С. 317–321.

19. Круглова, В. В. Жанравая парадыгма паэзіі Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Сборник работ 69-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, Минск, 14–17 мая 2012 г.: в 3 ч. / Белорус. гос. ун-т. – Минск: Изд. центр БГУ, 2013. – Ч. 3. – С. 44–248.

20. Круглова, В. В. Паэзія Янкі Лучыны ў перакладах / В. В. Круглова // Идеи. Поиски. Решения: материалы VI Междунар. науч.-практ. конф. преподавателей, аспирантов, магистрантов, студентов; Минск, 22 ноября 2012 г. / редкол.: Н. Н. Нижнева (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2013. – С. 499–505.

21. Круглова, В. В. Культурнае жыццё ў Мінску ў другой палове XIX – пачатку XX стст. і дзейнасць Янкі Лучыны / В. В Круглова // Фальклор, гісторыя і літаратура беларусаў у кантэксце культурнай спадчыны славян: зб. матэрыялаў II Рэспубл. студэнцкай навук.-практ. канф. да 70-годдзя з дня нар. Ніны Мацяш / Брэст, Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна 22 кастр. 2013 г.; рэдкал.: У. А. Сенькавец, І. А. Швед, А. М. Вабішэвіч. – Брэст: БрДУ, 2014. – С. 108–113.

22. Круглова, В. В. Асоба Янкі Лучыны ва ўспрыманні і ацэнцы Максіма Багдановіча / В. В. Круглова // Максім Багдановіч: дыялог з часам (асоба пісьменніка і яго творчасць у сусветным дыскурсе XX–XXI стст.): матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 21 снеж. 2016 г. / Літ. музей М. Багдановіча; уклад. М. М. Запартыка. – Мінск, 2017. – С. 50–53.

23. Круглова, В. В. Паэзія Янкі Лучыны і Янкі Купалы: ідэйныя і вобразныя аналогіі / В. В. Круглова // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: зб. навук. прац / рэдкал.: А. С. Садоўская (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2017. – С. 37–41.

24. Круглова, В. В. Роля і значэнне Янкі Лучыны ў станаўленні беларускага мастацкага перакладу / В. В. Круглова // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання [Электронны рэсурс]: матэрыялы IV Рэсп. навук.-практ. канф. маладых вучоных, Мінск, 17 сак. 2017 г. / рэдкал.: П. І. Навойчык (адк. рэд.) [і інш.]; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2017. – С. 122–130.

25. Круглова, В. В. Францыск Скарына і асветніцкія погляды Янкі Лучыны / В. В. Круглова // Асоба і творчая спадчына Францыска Скарыны: рэцэпцыя і інтэрпрэтацыя: матэрыялы V Міжнар. Скарынаўскіх чытанняў, прысвеч. 500-годдзю беларус. кнігадрукавання, 17–18 ліст. 2017 г., Мінск, БДУ / рэдкал.: д. ф. н. А. І. Бельскі [і інш.]. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2017. – С. 192–197.

26. Kruglova, O. Obraz przyrody w poematach Adama Mickiewicza «Pan Tadeusz» i Janki Łuczyny «Akwarelki myśliwskie» – aspekt porównawczy / O. Kruglova // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча: зб. арт. па матэрыялах міжнар. навук. канф. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: І. Э. Багдановіч (гал. рэд.) [і інш]; пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 59–69.

## РЭЗЮМЭ

Круглова Вольга Валянцінаўна

**Творчасць Янкі Лучыны ў кантэксце станаўлення беларускай літаратуры XIX стагоддзя**

**Ключавыя словы:** культурнае памежжа, жанравы сінтэз, метрычны рэпертуар, мастацкі пераклад, аўтабіяграфічнасць, мастацка-дакументальны нарыс, падарожны нарыс, героіка-рамантычны пафас.

**Мэта даследавання** – комплексна раскрыць спецыфіку творчасці Янкі Лучыны ў кантэксце ідэйна-мастацкага станаўлення і эвалюцыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

**Метады даследавання:** культурна-гістарычны, біяграфічны, параўнальна-гістарычны, супастаўляльна-тыпалагічны, метад сістэматызацыі і апісання.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Упершыню комплексна разгледжана творчасць Янкі Лучыны на трох мовах: польскай, беларускай, рускай – у рэчышчы працэсаў ідэйна-эстэтычнага станаўлення і развіцця літаратуры Беларусі XIX стагоддзя. Выпраўлены тэксталагічныя недакладнасці ў выданнях твораў Янкі Лучыны. Уведзены ў навуковы ўжытак дагэтуль невядомыя або недаследаваныя творы пісьменніка. Паказаны пазітыўны ўплыў творчасці пісьменніка на развіццё галоўных напрамкаў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Выяўлены асноўныя сэнсаўтваральныя матывы і найбольш значныя вобразы-сімвалы ў вершах паэта. На падставе разгляду метрычнага рэпертуару вершаваных твораў Янкі Лучыны, аналізу ролі рытму і інтанацыі ў яго лірыцы вызначана наватарства паэта ў галіне вершавання. Акрэслена значэнне паэмы Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» для станаўлення ліра-эпасу ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Вызначана наватарства публіцыстыкі Янкі Лучыны і яе месца ў кантэксце беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

**Практычная значнасць даследавання і галіна выкарыстання.** Вынікі працы могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы курсаў па гісторыі беларускай літаратуры, у практыцы выкладання беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Матэрыялы, атрыманыя ў працэсе даследавання, стануць падставай для стварэння манаграфіі пра жыццё і творчасць Янкі Лучыны, падрыхтоўкі новага пакалення вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, складання першага поўнага збору твораў Янкі Лучыны.

# РЕЗЮМЕ

Круглова Ольга Валентиновна

## Творчество Янки Лучины в контексте становления белорусской литературы XIX века

**Ключевые слова:** культурное пограничье, жанровый синтез, метрический репертуар, художественный перевод, автобиографичность, художественно-документальный очерк, путевой очерк, героико-романтический пафос.

**Цель исследования** – комплексно раскрыть специфику творчества Янки Лучины в контексте идейно-художественного становления и эволюции белорусской литературы XIX века.

**Методы исследования:** культурно-исторический, биографический, сравнительно-исторический, сопоставительно-типологический, метод систематизации и описания.

**Полученные результаты и их новизна.** Впервые комплексно рассмотрено творчество Янки Лучины на трех языках: польском, белорусском, русском – в ключе процессов идейно-эстетического становления и развития литературы Беларуси XIX века. Исправлены текстологическое неточности в изданиях произведений Янки Лучины. Введены в научный оборот до сих пор неизвестные или неисследованные произведения писателя. Показано позитивное влияние творчества писателя на развитие главных направлений белорусской литературы XIX века. Выявлены основные смыслообразующие мотивы и наиболее значимые образы-символы в стихах поэта. На основании рассмотрения метрического репертуара стихотворных произведений Янки Лучины, анализа роли ритма и интонации в его лирике определено новаторство поэта в сфере стихосложения. Определено значение поэмы Янки Лучины «Охотничьи акварельки с Полесья» для становления лиро-эпоса в белорусской литературе XIX века. Определено новаторство публицистики Янки Лучины и ее место в контексте белорусской литературы XIX века.

**Рекомендации по использованию и область применения полученных результатов.** Результаты работы могут быть использованы при разработке курсов по истории белорусской литературы, в практике преподавания белорусской литературы XIX века. Материалы, полученные в процессе исследования, станут основой для создания монографии о жизни и творчестве Янки Лучины, подготовки нового поколения учебных пособий для студентов филологических специальностей, составления первого полного сборника сочинений Янки Лучины.

## SUMMARY

Olga Kruglova

### Creativity by Yanka Luchina in the context of the establishment of the Belarusian literature of the XIX century

**Key words:** cultural borderlands, genre synthesis, metrical repertoire, artistic translation, autobiographical, artistic-documentary essay, travel essay, heroic and romantic pathos.

**Purpose of research** – to reveal comprehensively the specifics of creativity by Yanka Luchina in the context of the ideological and artistic formation and evolution of the Belarusian literature of the XIX century.

**Research methods:** culture-historical, biographical, comparative-historical, comparative-typological, method of systematization and description.

**The results obtained and their novetly.** For the first time the works by Yanka Luchina in three languages: Polish, Belarusian and Russian – in the key of the processes of the ideological and esthetic formation and development of literature of Belarus of the XIX century was reviewed comprehensively. Textual inaccuracies in the editions of works by Yanka Luchina were corrected. Still unknown or unexplored works by the writer have been put into scientific use. The positive influence of the writer's creativity on the development of the main directions of the Belarusian literature of the XIX century was shown. The main semantic motifs and the most significant images-symbols in the poet's verses were revealed. Based on the consideration of the metric repertoire of Yanka Luchina's poetic works, analysis of the role of rhythm and intonation in the his lyrics, the poet's innovation in the sphere of versification was determined. The significance of the poem by Yanka Luchiny «Hunting aquarelles from Polesye» for the formation of the lyre-epos in the Belarusian literature of the XIX century was determined. The innovation of publicistic works by Yanka Luchina and its place in the context of the XIX century Belarusian literature were defined.

**Recommendations on the usage of the research results and the field of application.** The results of the work can be used in the development courses on the history of Belarusian literature, in the practice of the XIX century Belarusian literature teaching. The materials received during the research will be the basis for writing the monograph about life and creativity of Yanka Luchina, foundation a new generation of textbooks for students of philological specialties, preparation the first complete collection of works by Yanka Luchina.